УДК 338:91

Н.Г. Бялкоўская

# Аб праблеме бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь

Пасля заканчэння Другой сусветнай вайны і стварэння ААН рэгуляванне міжнародных палітычных міграцый становіцца аб'ектыўнай неабходнасцю, і ў 1951 годзе прымаецца «Канвенцыя аб статусе бежанцаў», дапоўненая пазней Пратаколам 1967 года. У адпаведнасці з гэтымі міжнароднымі прававымі актамі ўстанаўліваюцца 4 асноватворныя адзнакі, неабходныя для атрымання статуса бежанца:

1. Знаходжанне за мяжой сваёй радзімы.
2. Нежаданне, а таксама немагчымасць атрымаць абарону ад урада краіны пражывання або нежаданне вяртацца на радзіму.
3. Дакладна абгрунтаваны страх і матывы праследавання.
4. Само паняцце матываў праследавання па адзнаках расы, веравызнання, нацыянальнасці або палітычных поглядаў [1–3].

Такім чынам, бежанец – гэта асоба, якая не з'яўляецца грамадзянінам дадзенай краіны і прыбывае на тэрыторыю іншай дзяржавы ў выніку насілля, што здзяйсняецца ў адносінах да яе, або праследавання па адзнацы расавай ці нацыянальнай прыналежнасці, веравызнання, мовы, а таксама па палітычных перакананнях. Калі такая асоба перамяшчаецца ўнутры краіны – ужываецца тэрмін «вымушаны перасяленец».

На сённяшні дзень у Рэспубліцы Беларусь створаны асноўныя ўмовы для эфектыўнага рэгулявання працэсаў міграцыі. Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь вызначана (арт. 11), што замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства на тэрыторыі Беларусі карыстаюцца правамі і свабодамі і выконваюць абавязкі нароўні з грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, калі іншае не вызначана Канстытуцыяй, законамі і міжнароднымі пагадненнямі (арт. 12). Рэспубліка Беларусь можа даваць права прытулку асобам, якія адчуваюць ганенні ў іншых дзяржавах за палітычныя, рэлігійныя перакананні або нацыянальную прыналежнасць.

Сёння ў рэспубліцы сфарміравана міграцыйнае заканадаўства, якое ўключае Законы «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь», «Аб іміграцыі», «Аб знешняй працоўнай міграцыі», «Аб бежанцах». Выконваюцца мерапрыемствы Дзяржаўнай міграцыйнай праграмы на 2001–2005 гг.

Рэспубліка Беларусь цалкам падзяляе агульнапрызнаныя міжнароднай супольнасцю прынцыпы вырашэння праблем міграцыі і актыўна ўдзельнічае ў міжнародных мерапрыемствах па ўрэгуляванні міграцыйнай сітуацыі. У маі 2001 г. Рэспубліка Беларусь ратыфікавала Канвенцыю 1951 г. аб статусе бежанцаў і Пратакол 1967 г., які датычыцца статуса бежанцаў. У сувязі з гэтым была падрыхтавана новая (трэцяя) рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь «Аб бежанцах», якая была прынята ў студзені 2003 г. Новы Закон «Аб бежанцах» адпавядае патрабаванням міжнароднага права. Названымі нарматыўнымі актамі вызначаны парадак рэгулявання міграцыйных працэсаў, паўнамоцтваў і задач органаў дзяржаўнай улады па кіраванні міграцыяй.

З 1997 г. у Рэспубліцы Беларусь функцыяніруе сістэма органаў дзяржаўнай міграцыйнай службы, якая ўключае ў сябе: Дэпартамент па грамадзянстве і

міграцыі МУС Рэспублікі Беларусь (да 2004 г. існаваў Камітэт па міграцыі пры Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны РБ), Упраўленне па грамадзянстве і міграцыі ГУУС Мінгарвыканкама і УУС аблвыканкамаў. У саставе Дэпартамента функцыяніруе Упраўленне па знешняй працоўнай міграцыі, бежанцах і прыстанішчы.

Тэрытарыяльныя органы па міграцыі праводзяць прыём іншаземцаў, якія хадайнічаюць аб прызнанні бежанцамі, і рэгіструюць іх хадайніцтвы; выдаюць іншаземцам часовыя пасведчанні аб рэгістрацыі хадайніцтваў аб прызнанні бежанцамі, разглядаюць зарэгістраваныя хадайніцтвы і рыхтуюць па іх заключэнні. За перыяд дзеяння Закона РБ «Аб бежанцах» у тэрытарыяльныя органы звярнуліся 2500 іншаземцаў.

Зараз (на 1.11.2004 г.) у Рэспубліцы Беларусь 735 іншаземцаў прызнаны бежанцамі. Па стане на 1 ліпеня 2003 г. у Рэспубліцы Беларусь пражывала 630 бежанцаў, з іх 40% – жанчыны, 36,1% – непаўналетнія, звыш 60% – працаздольнага ўзросту, 209 бежанцаў мелі вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю. З прызнаных бежанцамі ў апошнія гады ільвіную долю (531 чалавек) складаюць выхадцы з Афганістана, далей – з Грузіі (105), Таджыкістана (28), Эфіопіі (28), Азербайджана (27). Ёсць таксама жыхары Ірана, Ірака, Індыі, Камеруна і іншых краін свету. Найбольшая колькасць пражывае ў г. Мінску і Мінскай вобласці – 339 і 135 адпаведна, у Гомельскай вобласці пражываюць 97, Віцебскай – 26, Магілёўскай – 20, Брэсцкай – 9, Гродзенскай – 4 чалавекі (на 2003 г.).

Да гэтага часу ў рэспубліцы знаходзяцца ў складаным стане справы з рэгістрацыяй прызнаных бежанцамі, асабліва ў г. Мінску. Па стане на 1 ліпеня 2003 г. 389 чалавек маюць пасведчанне на права жыхарства, 93 – часовую рэгістрацыю, без рэгістрацыі пражываюць 148 чалавек, з іх асноўная маса ў г. Мінску. Многія сем'і бежанцаў, нягледзячы на ільготную норму для прапіскі, не могуць самастойна вырашыць пытанні свайго пасялення. З-за адсутнасці прапіскі ў бежанцаў узнікаюць праблемы з працаўладкаваннем, доступам да паслуг аховы здароўя і нацыянальнай сістэмы адукацыі. Але трэба адзначыць, што некаторыя бежанцы, якіх пасялілі ў інтэрнаты на тэрыторыі горада Мінска, дзякуючы фінансавай падтрымцы УВКБ ААН, усё ж афармілі пасведчанне на права жыхарства і атрымалі магчымасць вырашыць пытанне аб сваім працаўладкаванні, у тым ліку пры дапамозе Мінскай гарадской службы занятасці. Разам з тым амаль трэць бежанцаў, якія знаходзяцца на ўліку ў Мінскай гарадской міграцыйнай службе, з'яўляюцца шматсямейнымі і пражываюць без рэгістрацыі, не жадаючы перасяліцца ў іншую мясцовасць у адпаведнасці з квотамі прыёму бежанцаў, зацверджанымі ўрадам (у цяперашні час рэспубліка адмовілася ад квоты на пасяленне бежанцаў, захоўваючы толькі квоту на іх рэгістрацыю).

Востра стаіць праблема занятасці прызнаных бежанцамі. Многія з іх з-за аб'ектыўных прычын неканкурэнтаздольныя на нацыянальным рынку працы. З 392 бежанцаў у працаздольным узросце працуюць па найме 53, займаецца прадпрымальніцкай дзейнасцю 61 чалавек, г.зн. 15% бежанцаў маюць даходы ад уласнага бізнесу і 15% атрымліваюць рэгіструемыя даходы ад работы па найме. У Гомельскай, Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай, Віцебскай абласцях ад 74 да 55% бежанцаў самастойна зарабляюць сродкі для існавання. У г. Мінску і Мінскай вобласці працаўладкаваны толькі 10% бежанцаў. Мінская абласная міграцыйная служба ў свой час неаднаразова прадпрымала спробы вырашыць пытанне працаўладкавання бежанцаў у калгасах і саўгасах Мінскай вобласці. Аднак і па сённяшні дзень не ўдалося ажыццявіць ніводнага праекта, звязанага з працаўладкаваннем і перасяленнем бежанцаў у сельскую мясцовасць, паколькі бежанцы, будучы

галоўным чынам гараджанамі, у сваёй аснове не гатовы да працы ў сельскай гаспадарцы ў якасці механізатараў або жывёлаводаў. Асабліва гэта датычыцца бежанцаў з краін Азіі і Афрыкі. Праблемы працаўладкавання бежанцаў у Рэспубліцы Беларусь ускладняюцца і тым, што іх асноўная маса страціла свае папярэднія прафесійныя навыкі і ўменні і для працаўладкавання патрабуецца іх прафесійная перакваліфікацыя.

Акрамя таго, большасць іншаземцаў, якія атрымалі на тэрыторыі нашай рэспубліцы статус бежанцаў, маюць значныя сацыяльна-культурныя адрозненні ў параўнанні з РБ, і гэта безумоўна абцяжарвае іх інтэграцыю ў соцыум новай для іх краіны, параджае ў значнай меры праблемы недаверу і напружанасці ў месцах працаўладкавання і пражывання з грамадзянамі нашай краіны.

Органы па міграцыі змаглі ажыццявіць шэраг праектаў, звязаных з пасяленнем асоб, прызнаных бежанцамі. Пры фінансавай падтрымцы УВКБ ААН быў зроблены неабходны рамонт і добраўпарадкаванне жылых памяшканняў, што выдзяляліся мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі для пасялення бежанцаў у г. Пінску Брэсцкай вобл., г. Лёзна Віцебскай вобл., г. Мінску, г. Лагойску і г. Стоўбцы Мінскай вобл. У выніку рэалізацыі праектаў было паселена 24 чалавекі, у тым ліку 5 сем'яў і 4 чалавекі з ліку дзяцей-сірот. У г. Віцебску адчынены пункт часовага размяшчэння асоб, якія хадайнічаюць аб прызнанні бежанцамі, на 30 месцаў. У адпаведнасці з існуючым заканадаўствам усе дзеці-бежанцы, у залежнасці ад жадання бацькоў, атрымліваюць адукацыю у сярэдніх навучальных установах, наведваюць дзіцячыя дашкольныя ўстановы. У Рэспубліцы Беларусь у адпаведнасці з заканадаўствам рэалізуецца права бежанцаў на сацыяльную абарону, у тым ліку на сацыяльнае забеспячэнне, гэта права рэалізуецца ў той ці іншай ступені ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі.

Аднак для вырашэння праблемы бежанцаў у РБ патрабуюцца дадатковыя намаганні дзяржаўных органаў, якія займаюцца праблемамі міграцыі. Найбольш складанай праблемай з'яўляецца пасяленне асоб, якія шукаюць прыстанішча, і бежанцаў, паколькі Рэспубліка Беларусь не можа (па эканамічных прычынах) даваць ім жыллё.

Відавочна, што вырашэнне пытанняў адаптацыі і сацыяльнай інтэграцыі імігрантаў на тэрыторыі нашай рэспублікі можна станоўча вырашаць толькі пры фінансавай і іншай дапамозе міжнародных арганізацый, таму неабходна высока ацаніць адпаведную дапамогу з боку УВКБ ААН, Службу па кансультаванні бежанцаў Беларускага руху медыцынскіх работнікаў.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Загорец М.В.*** Миграция населения и иммиграционная политика. – Мн., 2000.
2. ***Материалы Департамента по гражданству и миграции МВД РБ.***
3. ***Материалы международного семинара «Система защиты беженцев и предоставления убежища в РБ».*** – Мн., 24–26 сентября 2003 г.



## *SUMMARY*

*Some aspects of a refugee problem and legislative base which regulates the processes of the compelled migration in the Republic of Belarus are considered. The estimation of scales and geography of the compelled migration in Belarus is given, the problems of adaptation and integration of foreign citizens in the social and economic environment of the country are shown.*


*Поступила в редакцию 8.12.2004*